# Адкрылася выстаўка артэфактаў з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

28.03.2020 00:40 | Аўтар: **Вікторыя Аскера** | **Культура**

Навіны | Папул
12:07 Мінфін змяніў ... каштоўныя металы, ш... ў фізічных асоб
11:40 "Белнафтахім" ... НПЗ у красавіку паст... нафты
10:58 У Лунінецкім р... пенсіянер, які наводз... дома
10:53 Ва Украіне ад... зямлі з 1 ліпеня 2021
10:00 Культурныя п... Беларусі запусцілі краўдфандынгавую ... #АРТпраязны
08:52 У Маскве меда... мёртвую бабулю з жы...
УСЕ НАВ

**Дзякуючы маштабнаму праекту, прысвечанаму 75-годдзю Вялікай Перамогі і рэалізаванаму Міністэрствам інфармацыі і лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімірам Ліхадзедавым пры падтрымцы Міністэрства культуры, у Нацыянальным гістарычным музеі ўрачыста адкрылася выстаўка «Вайна і мір. Вяртанне».**




У экспазіцыі прадстаўлены багатая калекцыя старадаўніх паштовак з выявамі беларускіх гарадоў пачатку XX стагоддзя, унікальныя рукапісныя дакументы XVI-XVII стагоддзяў, старадрукаваныя і рэдкія кнігі, перыядычныя выданні XVIII-XIX стагоддзяў.

Упершыню дэманструюцца шырокай публіцы і такія артэфакты, як пісьмовы прыбор князёў Радзівілаў, медаль за ўзяцце горада Полацка Стэфанам Баторыем у 1579 годзе, памятная чыгунная пліта да 500-годдзя перамогі ў Грунвальдскай бітве (1910), медаль удзельніка перагавораў па Брэсцкім міры 1918 года, драўляныя скульптуры XVII-XVIII стагоддзяў, напрастольны крыж і складзень каталіцкі ды праваслаўны канца XIX стагоддзя.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, дырэктар выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў і дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Павел Сапоцька.

> — Перамога кавалася не толькі з 1941 да 1945 года. Гераізм нашых продкаў фарміраваўся на працягу доўгіх гадоў, — адзначыў на адкрыцці праекта намеснік міністра інфармацыі. — Святкаванне 75-годдзя Вялікай Перамогі сімвалізуе кропку ў гісторыі кровапраліцця на беларускай зямлі і прымнажэнне новых мірных перамог. Мір, што ў назве, — час вяртання страчанага. І дзякуючы такім энтузіястам, як Уладзімір Ліхадзедаў, мы можам бачыць нашы гістарычныя каштоўнасці, грані гэтай Вялікай Перамогі. Такія выстаўкі вельмі важныя для грамадства.

Частка экспанатаў падорана Уладзімірам Ліхадзедавым Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Нацыянальнаму гістарычнаму музею. На адкрыцці выстаўкі ў дар музею перададзеныя паштовыя паштоўкі з відамі беларускіх гарадоў, кнігі, сярэбраныя лыжкі і чарка XIX-XX стагоддзяў.

**Вікторыя АСКЕРА**

Іншыя матэрыял...
У Нацыянальным гіст... прэзентавалі творы м... Манпарнаса
З дня нараджэння Яз... спаўняецца 130 гадоў
Беларускія мастакі ўз... дабрачыннай акцыі «... дзейнічае»
Выстава «Маладзік і ... Акадэміі мастацтваў
Як намаляваць пах к...